Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 264 (333)
СУБОТА 16 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСТ УРАДЖАЙНАСЦІ!

Сёння мы друкуем пастанову Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б «Аб аплаце старшынь калгасаў, аб заахвочванні звенняў і брыгадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці». Большэвіцкае ажыццяўленне гэтай пастановы будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню грамадскай гаспадаркі, росту прадукцыйнасці працы, ураджайнасці ў калгасах рэспублікі.

З асяроддзя працоўнага сялянства партыя Леніна—Сталіна вырасціла сотні тысяч выдатных арганізатараў, ініцыятыўных, да канца адданых сваёй радзіме людзей. Гэта старшыні, брыгадзіры, звеннявыя калгасаў, загадчыкі ферм і т. д., якія ўмелым кіраўніцтвам, асабістым прыкладам вядуць за сабой масы калгаснікаў, натхняюць іх на чэсную і стаханаўскую працу ў імя радзімы, у імя далейшага росквіту калгасаў.

Агульнавядома, якую велізарную ролю ў жыцці калгаса адыгрывае старшыня. Ад яго дзейнасці залежыць вельмі многа. Там, дзе старшыня арцелі з'яўляецца сапраўдным важаком мас калгаснікаў, там дзе старшыня ставіць вышэй за ўсё інтарэсы совецкай дзяржавы, — там арцельная гаспадарка вядзецца правільна, з кожным годам атрымлівае новыя перамогі, там паспяхова развіваюцца ўсе галіны грамадскай гаспадаркі.

Работа старшыні калгаса — складаная і вельмі адказная. Гэта вынікае з складанасці самой арцельнай гаспадаркі. Сучасны калгас — гэта шматгранная гаспадарка, гэта сотні і тысячы гектараў ворыўнай зямлі і сенажаці, садоўніцтва, жывёлагадоўчыя фермы, дзесяткі розных машын і т. д. Гэта гаспадарка, якая мае перад сабой багацейшыя перспектывы. І ясна, што старшыня калгаса павінен быць палітычна передавым, ініцыятыўным, добрым арганізатарам, удумлівым гаспадаром.

Партыя і ўрад праяўляюць велізарныя клопаты аб выхаванні кіруючых калгасных кадраў, аб стварэнні ім спрыяючых умоў для работы, аб іх палітычным росце, аб узбагачэнні іх гаспадарчым вопытам.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб аплаце старшынь калгасаў садзейнічае паляпшэнню іх работы. Розныя, зразумела, бываюць арцелі па аб'ёму сваёй гаспадаркі, па даходнасці. І было-б таму няправільна дапускацьураўнілаўку пры аплаце старшынь розных калгасаў. Наадварот, аплата праводзіцца ў залежнасці ад колькасці пасеўнай плошчы, ад агульнай сумы грашовых даходаў калгасаў.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б прапанавалі налічаць старшыням калгасаў дадаткова працадні ў залежнасці ад стажа работы: працуючаму ў калгасе старшынёй трэці год — у размеры 5 проц., чацверты год — 10 проц., пяць год і больш — 15 проц., да ўстаноўленай штомесячнай аплаты ў працаднях. Гэтае мерапрыемства накіравана на замацаванне кіруючых калгасных кадраў.

У сваёй пастанове Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б прапануюць калгасам «увесці дадатковае налічэнне працадзён калгаснікам, працуючым у звеннях калгасных брыгад або ў брыгадах, за кожны атрыманы ў іх звяне або брыгадзе, звыш устаноўленага плана ўраджайнасці цэнтнер зерневых і зярнё-бабовых культур — 2—3 працадні. Працадні, налічаныя дадаткова за перавыкананне плана ўраджайнасці, размяркоўваць паміж членамі звяна або брыгады ў адпаведнасці з агульнай колькасцю працадзён, выпрацаваных кожным з іх».

Апрача таго кіраўніку звяна налічваюцца працадні дадаткова за кіраўніцтва звяном у размеры 2—3 проц. ад агульнай колькасці працадзён, выпрацаваных усім звяном. Пастановай таксама прадугледжана заахвочванне брыгадзіраў паляводчых брыгад.

Такі парадак аплаты працы заахвочвае калгаснікаў на барацьбу за перавыкананне дзяржаўных заданняў па ўраджайнасці.

Каб па-большэвіцку выканаць пастанову СНК БССР і ЦК КП(б)Б, каб сапраўды заахвочваць калгаснікаў на барацьбу за высокі ўраджай, трэба перш за ўсё навесці ўзорны парадак у арганізацыі працы, трэба раз і назаўсёды пакончыць з абязлічваннем работы звяна. Можна прывесці многа фактаў, калі два звяны аднаго калгаса атрымліваюць аднолькавую ўзнагароду за сваю працу, хоць адно звяно працуе па-стаханаўску, атрымлівае высокі ўраджай, а другое звяно працуе дрэнна і збірае нізкі ўраджай. Кожны чэсна працуючы калгаснік скажа, што такі парадак несправядлівы. Чаму так атрымліваецца? Таму, што работа звенняў абязлічана, што часта яны існуюць толькі на паперы, у зводках райземаддзела, а ў сапраўднасці іх няма. Людзі працуюць скопам, к канцу года ўлічваецца сярэдні ўраджай па ўсяму калгасу. Які-ж быў ураджай у паасобных звеннях — ніхто не ведае.

Трэба пакончыць з такім «парадкам». Трэба забяспечыць у кожным калгасе арганізацыю і чоткую работу пастаянных паляводчых звенняў, дабіцца поўнага ўліку ўраджайнасці па звеннях і з гэтага-ж зыходзіць пры аплаце працы калгаснікаў.

Вопытам передавых калгасаў даўно даказана, што высокі ўраджай у першую чаргу з'яўляецца вынікам правільнай арганізацыі працы.

Вось прыклад. 3 года ў год атрымлівае высокія ўраджаі ордэнаносны калгас імені Валадарскага, Магілеўскага раёна. Звенні па асобных культурах тут існуюць яшчэ з 1938 года. Але на гэтым у калгасе не спыніліся. Рашылі, што недастаткова мець звенні толькі па асобных культурах, што за звеннямі павінны быць замацаваны ўсе пасевы. На 1940 год у кожнай брыгадзе арганізавалі па тры пастаянныя звяны. За імі замацавалі на ўвесь севаабарот участкі зямлі, коней, павозкі, плугі, бораны, сеялкі, дробны інвентар. Апрача гэтага кіраўніцтва калгаса сур'ёзна прадумала сістэму ўчоту і аплаты працы калгаснікаў, каб плаціць не толькі па колькасці працадзён, а і па выніках работы — па ўраджайнасці. Адразу-ж сказаліся рэзультаты. У мінулыя годы веснавая сяўба прадаўжалася 8—10 дзён, а пасадка бульбы — не менш 14—16 дзён. У гэтым-жа годзе такі-ж аб'ём работы быў выканан амаль у два разы хутчэй. Па плану калгас павінен быў правесці ўборку зерневых і ільну на працягу 10 дзён, а правёў за 8 дзён. Ураджай атрымалі па 18 цэнтнераў азімай пшаніцы з гектара, па 18 цэнтнераў ячменю, па 16 цэнтнераў жыта, па 14 цэнтнераў яравой пшаніцы, па 15 цэнтнераў аўса.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б накіравана на далейшы ўздым прадукцыйнасці працы ў калгасах рэспублікі. Партыйныя і совецкія арганізацыі на месцах, зямельныя органы абавязаны дапамагчы калгасам узорна ажыццявіць гэту пастанову.

(Перадавы артыкул «Звязды»).

Аб аплаце старшынь калгасаў, аб заахвочванні звенняў і брыгадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі

У мэтах далейшага ўздыму ўраджайнасці і ўмацавання грамадскай калгаснай гаспадаркі, Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі **пастанаўляюць:**

Устанавіць наступны парадак і размер аплаты старшынь калгасаў, заахвочвання звенняў і брыгадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці:

1. Налічаць старшыням калгасаў працадні за кожны месяц работы ў наступных размерах:

пры пасеўнай плошчы ў калгасе (уключаючы агароды, сады і ягаднікі) да 100 гектараў—45 працадзён;

ад 101 гектара да 300 гектараў — 50 працадзён;
ад 301 да 500 гектараў — 55 працадзён;
ад 501 да 700 гектараў — 60 працадзён;
ад 701 да 1.000 гектараў — 70 працадзён;
ад 1.001 да 1.500 гектараў — 80 працадзён;
звыш 1.500 гектараў — 90 працадзён у месяц.

2. Выдаваць старшыням калгасаў штомесячна грашовую даплату ў размерах: пры агульнай суме грашовых даходаў калгаса ў год

да 10 тысяч рублёў	25 руб.
ад 10 да 25 тыс. руб.	50 руб.
ад 25 да 50 тыс. руб.	75 руб.
ад 50 да 100 тыс. руб.	125 руб.
ад 100 тыс. руб. да 200 тыс руб.	150 руб.
ад 200 тыс. руб. да 300 тыс. руб.	175 руб.
ад 300 тыс. руб. да 400 тыс. руб.	200 руб.
ад 400 тыс. руб. да 500 тыс. руб.	225 руб.
ад 500 тыс. руб. да 600 тыс. руб.	250 руб.
ад 600 тыс. руб да 700 тыс. руб.	275 руб.
ад 700 тыс. руб. да 800 тыс. руб.	300 руб.
ад 800 тыс. руб. да 900 тыс. руб.	325 руб.
ад 900 тыс. руб. да 1.000 тыс. руб.	350 руб.
ад 1.000 тыс. руб. і вышэй	400 руб. у месяц.

3. Да высвятлення канчатковай сумы грашовага даходу размер даплаты старшыням калгасаў устанавіць, зыходзячы з сумы грашовага даходу за мінулы год.

Штомесячна старшыням калгасаў выплачваць 70 процантаў ад устаноўленай даплаты. Канчатковы разлік з старшынямі калгасаў праводзіцца ў канцы года пасля зацвярджэння гадавой справаздачы агульным сходам калгаснікаў і разгляду гадавой справаздачы калгасаў прэзідыумам раённага выканкома Совета дэпутатаў працоўных.

4. Прапанаваць калгасам налічаць дадаткова працадні ў залежнасці ад стажа работы старшыням калгасаў, працуючым у калгасе трэці год, у размеры —5 проц., чацверты год—у размеры 10 проц., працуючым 5 год і больш—15 проц. да ўстаноўленай штомесячнай аплаты ў працаднях.

5. Прапанаваць калгасам увесці дадатковае налічэнне працадзён калгаснікам, працуючым у звеннях калгасных брыгад або ў брыгадах, за кожны атрыманы ў іх звяне або брыгадзе, звыш устаноўленага плана ўраджайнасці, цэнтнер зерневых і зярнё-бабовых культур—2—3 працадні.

Працадні, налічаныя дадаткова за перавыкананне плана ўраджайнасці, размяркоўваць паміж членамі звяна або брыгады ў адпаведнасці з агульнай колькасцю працадзён, выпрацаваных кожным з іх.

6. Кіраўніку звяна звыш таго налічаць працадні дадаткова за кіраўніцтва звяном у размеры 2—3 проц. ад агульнай колькасці працадзён, выпрацаваных усім звяном.

7. У мэтах заахвочвання брыгадзіраў калгасаў у павышэнні ўраджайнасці, прапанаваць калгасам звыш устаноўленай пастаяннай аплаты налічаць у канцы года прэмію брыгадзіру паляводчай брыгады пры перавыкананні плана ўраджайнасці брыгады па асноўных культурах да 10 проц. у размеры 50—60 працадзён; пры перавыкананні плана ўраджайнасці ад 10 да 20 проц.—75—90 працадзён і пры перавыкананні плана ўраджайнасці на 20 проц. і вышэй—у размеры 100—120 працадзён.

8. Гэту пастанову ўвесці ў дзеянне з 1 лістапада 1940 года.

Старшыня СНК БССР І. БЫЛІНСКІ.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.

Тэлеграма Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава Рэйхсканцлеру Германіі п. Гітлеру

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў адправіў з совецка-германскай граніцы п. Гітлеру тэлеграму наступнага зместу:

«Рэйхсканцлеру Германіі пану Гітлеру. Берлін.

Пакідаючы межы Германіі, прашу Вас, пан рэйхсканцлер, прыняць удзячнасць за радушны прыём, аказаны мне ў Германіі.

МОЛАТАЎ.

Малкіня. 14 лістапада 1940 г.»

Тэлеграма Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава Міністру Замежных Спраў Германіі п. фон Рыбентропу

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў В. М. Молатаў адправіў з совецка-германскай граніцы міністру замежных спраў Германіі п. фон Рыбентропу тэлеграму наступнага зместу:

Рэйхсміністру замежных спраў, Яго правасхадзіцельству п. фон Рыбентропу. Берлін.

Благаваліце прыняць, пан рэйхсміністр, маю шчырую ўдзячнасць за шырокі і цёплы прыём, аказаны мне і маім спадарожнікам у памятныя дні прабывання ў Германіі.

МОЛАТАЎ.

Малкіня. 14 лістапада 1940 г.»

ПРЫЗЫЎ У РАМЕСЛЕНЫЯ, ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ І ШКОЛЫ ФЗА

Буду вучыцца на „выдатна“

Мне 14 год. Сёння адзін з самых радасных дзён у маім жыцці. Мяне прынялі ў чыгуначнае вучылішча.

Я марыў стаць машыністам: гэта спецыяльнасць мне вельмі падабаецца. Падабаецца вадзіць вялікія саставы па неабсяжных прасторах нашай краіны! І я рашыў абавязкова стаць машыністам.

Калі я ішоў на прызыўную камісію, крыху хваляваўся, думаў, што могуць і не прыняць. Але маё хваляванне было дарэмным. Медыцынская камісія прызнала мяне зусім здаровым.

Я абяцаю прыкласці ўсе намаганні, каб стаць высокакваліфікаваным спецыялістам, буду вучыцца толькі на «выдатна»!

Еўгеній ВІЛЬЧЫНСКІ,
прызыўнік у чыгуначнае вучылішча.

Своечасова падрыхтавацца да пачатку заняткаў

Актыўна праходзіць прызыў у Беластоцкае чыгуначнае вучылішча.

1-га снежня пачнуцца заняткі. Ужо цяпер трэба падрыхтаваць памяшканні, вучэбныя дапаможнікі, інструменты і т. д. Павінны быць прыняты ўсе захады, каб прызыўнікі мелі поўную магчымасць для добрай вучобы.

Вучылішча ствараецца на базе былой тэхнічнай чыгуначнай школы. Абсталяванне і інструменты гэтай школы будуць скарыстаны для чыгуначнага вучылішча. Хоць ёсць некаторая колькасць станкоў і інструментаў, аднак падрыхтаванасць да вучэбнага года выклікае трывогу.

Для значнай часткі прызыўнікоў адсутнічае інтэрнат. Нядаўна для чыгуначнага вучылішча выдзелілі памяшканне пад інтэрнат на 100 чалавек, аднак памяшканне патрабуе рамонту. Сродкі-ж для гэтай мэты ўпраўленне Беластоцкай чыгункі не адпускае. Такім чынам ствараецца яўная пагроза, што вучні астануцца без інтэрната. Не лепш абстаіць справа і з сталовай. Ніхто яшчэ не ведае, дзе яна будзе знаходзіцца.

Выключна нездавальняюча абстаіць справа з падрыхтоўкай інструментаў. Нехапае малаткоў, разцоў, напільнікаў. Стары інструмент прышоў у нягоднасць.

Упушчана таксама такое важнае пытанне, як укамплектаванне штата майстраў. Чыгуначнаму вучылішчу патрэбны высокакваліфікаваныя майстры для падрыхтоўкі памочнікаў машыністаў, майстры для абучэння брыгадзіраў пуці. Між тым штат яшчэ не поўнасцю ўкамплектаван.

Час, які астаўся для падрыхтоўкі да пачатку вучэбнага года, трэба скарыстаць для ліквідацыі гэтых недахопаў.

І. Давыдаў.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных

ХЕЛЕНА ЮЗЕФАЎНА ПІЛЕЦКАЯ

Акруговая выбарчая камісія Аўгустоўскай Гарадской выбарчай акругі № 18 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Хелену Юзефаўну Пілецкую, 1921 года нараджэння, члена ВЛКСМ, трактарыстку Аўгустоўскай МТС.

СТАНІСЛАЎ ЭДУАРДАВІЧ РЫБАЛТОЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Штабінскай выбарчай акругі № 21, Аўгустоўскага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Станіслава Эдуардавіча Рыбалтоўскага, 1892 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1917 года, намесніка старшыні аблвыканкома.

ОЛЬГА ІОСІФАЎНА СОЛАМАВА

Акруговая выбарчая камісія Кузніцкай выбарчай акругі № 43 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Ольгу Іосіфаўну Соламаву, 1920 года нараджэння, члена ВЛКСМ, настаўніцу пачатковай сельскай школы вёскі Іванаўцы, Подлінскага сельсовета.

ІВАН ЯКАЎЛЕВІЧ КУЛЬБАЦКІ

Акруговая выбарчая камісія Капцеўскай выбарчай акругі № 44 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Івана Якаўлевіча Кульбацкага, 1902 года нараджэння, члена ВКП(б), працуючага першым сакратаром Гродненскага райкома КП(б)Б.

ІРЫНА ВАЎЖЫНАЎНА ВІШНЕЎСКАЯ

Акруговая выбарчая камісія Едвабнаўскай выбарчай акругі № 48 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Ірыну Ваўжынаўну Вішнеўскую, 1919 года нараджэння, члена ВЛКСМ, працуючую старшынёй гарадскога Совета.

МАКАР КЛІМАВІЧ КОРАБАЎ

Акруговая выбарчая камісія Радзілаўскай выбарчай акругі № 50 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Макара Клімавіча Корабава, 1901 года нараджэння, члена ВКП(б), працуе начальнікам абласнога ўпраўлення міліцыі па Беластоцкай вобласці.

СЯРГЕЙ МІХАЙЛАВІЧ КАРТАШОЎ

Акруговая выбарчая камісія Міхайлоўскай выбарчай акругі № 54 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Сяргея Міхайлавіча Карташова, 1895 года нараджэння, члена ВКП(б), працуе ўпраўляючым тэкстыльнага трэста.

ОЛЬГА МАКСІМАЎНА СЕМЯНЮК

Акруговая выбарчая камісія Рыбалоўскай выбарчай акругі № 55 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Ольгу Максімаўну Семянюк, 1902 года нараджэння, беспартыйную, працуе старшынёй сельсовета.

ІВАН ДАВЫДАВІЧ СКАЎРОНСКІ

Акруговая выбарчая камісія Заблудаўскай выбарчай акругі № 56 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Івана Давыдавіча Скаўронскага, 1905 года нараджэння, беспартыйнага, працуе загадчыкам аддзела тэхнічнага кантролю скурзавода.

НІКАЛАЙ ФІЛІПАВІЧ ДУБІНІН

Акруговая выбарчая камісія Кольнаўскай выбарчай акругі № 57 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Нікалая Філіпавіча Дубініна, 1906 года нараджэння, члена ВКП(б), працуе пракурорам Беластоцкай вобласці.

БАРЫС МАЙСЕЕВІЧ ЗЕЛЬМАНАЎ

Акруговая выбарчая камісія Сакалкаўскай выбарчай акругі № 78 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Барыса Майсеевіча Зельманава, 1906 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1929 года, працуючага адказным рэдактарам абласной газеты «Вольная праца».

АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ БАЗЫЛЕЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Стаўіскаўскай выбарчай акругі № 58 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Аляксандра Іванавіча Базылеўскага, 1899 года нараджэння, члена ВКП(б), працуючага старшынёй Кольнаўскага райвыканкома.

МАР'ЯННА АПАЛІНАРАЎНА КАВАЛЬЧЫК

Акруговая выбарчая камісія Ляхаўскай выбарчай акругі № 59 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Мар'янну Апалінараўну Кавальчык, 1916 года нараджэння, беспартыйную, калгасніцу.

ІРУХІМ ІЦКАВІЧ ЛАБЕНДЗІК

Акруговая выбарчая камісія Крынкаўскай выбарчай акругі № 60 зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Ірухіма Іцкавіча Лабендзіка, 1875 года нараджэння, рабочага скурзавода № 6, маючага вытворчы стаж 52 годы, стаханавец.

Паведамленні ТАСС

Юнайтэд Прэс паведамляе: «У дыпламатычных кругах паведамляюць, што Японія дасягнула пагаднення з Совецкім Саюзам, якое вызначае сферы ўплыву на Далёкім Усходзе і прадугледжвае спыненне дапамогі Чунцыну з боку Совецкага Саюза».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

* * *

Газета «Нью-Йорк уорд тэлеграф» апублікавала паведамленне рэдактара замежнага аддзела газетнага трэста Скрыпс Говарда-Сімса, які сцвярджае, быццам-бы японскі пасол у Маскве Татэкава прапанаваў Совецкаму Саюзу «усю або частку Брытанскай Індыі, калі Совецкі Саюз далучыцца да коаліцыі трох дзяржаў», а таксама зрабіў прапанову «аб уступцы Усходняй Сібіры Японіі».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне з'яўляецца недарэчным і зусім не адпавядае сапраўднасці.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Паўночнай выбарчай акругі № 16, горада Ломжы! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Філіпа Іосіфавіча ПАПОВА!

★ ★ ★

Філіп Іосіфавіч Папоў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Філіп Іосіфавіч Папоў нарадзіўся ў 1902 годзе ў вёсцы Затоціна, паблізу станцыі Рудня, якая ляжыць на поўшляху ад Смаленска да Віцебска. Юнацтва Філіпа было бязрадаснае. У доме бацькі заўсёды востра адчуваўся недахоп сродкаў да існавання. Ураджай з двух гектараў падзолістай зямлі не забяспечваў хлебам сям'ю у шэсць едакоў. Бацька Філіпа работу на вузенькіх нівах дапаўняў адходніцтвам — працаваў на рамонце палатна чыгункі. Дзеці ўлетку знаходзілі сабе кавалак хлеба ў гаротнай працы на кулакоў, пасучы жывёлу.

Работа на кулака была не толькі цяжарам, але і невыноснай боллю. Як толькі займалася зара, гаспадары выганялі са двара жывёлу і ўслед за ёй пастуха. Па балотах, багнішчах, ад зары да зары блукаў Філіп за жывёлай. Колькі вёрст выхаджана, колькі зняваг у раннім юнацтве перанесена!

Аднойчы, знемагаючы ад стомленасці, заснуў Філіп у полі. Узбудзіў яго дзікі крык лютага воўка—хутараніна-кулака. Спалоханы падняўся Філіп і ўбачыў жывёлу ў канюшыне. Кінуўся выганяць яе, але злосны ўдар дубцом моцна апаліў плечы. Філіп, як ужалены, падскочыў і пабег да лесу. Па слядах гнаўся раз'юшаны з пенай у роце кулак Шчэмялёў. Нечакана круты абрыў — зваліўся на завал дрэў, згубіў прытомнасць. Па сухіх сучках заваленага дрэва струменілася кроў з рассечанай губы, параненых рук і грудзей.

...Ціха ішоў Філіп да сваей вёскі, аглядаючыся па баках, у надзеі знайсці сабе абарону ў сям'і. Але голад, нездаволенасць бацькі самавольным прыходам прымусілі яго зноў вярнуцца да кулака.

...У голадзе і смертаноснай імперыялістычнай вайне праходзіць 1915 год. Філіп ужо стаў рослым, «самастойным». Ён працуе ў Смаленску на катушкавай фабрыцы. З 10 гадзін вечара да 10 гадзін раніцы снуе ён па сушылцы, адносіць катушкі ў сартыровачную. Аднойчы ён не зусім прасушаныя катушкі аднёс у сартыровачную. Гэта заўважыў майстар. Цяжкая рука дарослага грубага чалавека кранулася юнака пляча і паследаваў выкрык:

— Убірайся вон, такія нам не патрэбны!

З цяжкасцю дабраўся Філіп да Віцебска, дзе працаваў яго бацька. Разам з бацькам стаў працаваць на кар'еры, грузіць баласт. Пасля навучыўся падбіваць шпалы.

...Краіна калыхалася чырвонымі сцягамі рэволюцыі. Рабочы клас, узяўшы ўладу ў свае рукі, гераічна разбіваў ва ўзброенай барацьбе насядаўшыя на маладую совецкую рэспубліку полчышчы замежных інтэрвентаў і рускіх белагвардзейцаў. У 1919 годзе Філіп добраахвотнікам уступае ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.



... 1923 год. Зноў вёска, але свая, родная. Філіп — комсамолец. Часць асобага прызначэння ад комсамольскай арганізацыі вёскі Загоціна атрымлівае актыўную дапамогу ў барацьбе з апошнімі падонкамі контррэволюцыі—бандытызмам. Філіп цяпер добра разумее сваю задачу, як члена ленінскага комуністычнага саюза моладзі. І ён выконвае яе з чэсцю.

1924 год. Прызыў на сапраўдную службу ў рады Чырвонай Арміі. Філіп свядомы, палітычна развіты баец. Ён кіруе комсамольскай арганізацыяй, паказваючы прыклад узорнага выканання воінскага абавязку. Будучы ў радах Чырвонай Арміі, у 1926 годзе ён уступае ў члены комуністычнай партыі большэвікоў. У гэтым-жа годзе ён дэмабілізуецца ў званні малодшага камандзіра.

— Чырвоная Армія, ленінскі комсамол, вялікая партыя Леніна — Сталіна, —гаворыць тав. Папоў,— навучылі мяне правільна, па-комуністычнаму зразумець жыццё. Актыўны ўдзел у барацьбе за справу рабочых і працоўных сялян, за комунізм стаў патрэбнасцю жыцця. Усведамленне свайго чалавечага дастоінства я атрымаў ад партыі, якая мяне вырасціла, і ўся мая работа ў далейшым непарыўна звязана з большэвіцкай партыяй.

1926 — 1931 годы тав. Папоў працуе на кіруючай совецкай і гаспадарчай рабоце. 1931—1934 гады — вучыцца ў комуністычнай вышэйшай навучальнай установе, дзе атрымлівае неабходную адукацыйную падрыхтоўку. Затым працуе намеснікам, а потым начальнікам палітаддзела соўгаса імені Кірава, Слуцкага раёна, Мінскай вобласці. Ацаніўшы добрыя арганізатарскія здольнасці і практычнае ўменне па-партыйнаму правільна вырашаць пытанні сельскай гаспадаркі, партыя ставіць Філіпа Іосіфавіча на больш адказны пост — загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам Слуцкага акруговага камітэта КП(б)Б.

У 1938 годзе Філіп Іосіфавіч паспяхова заканчвае курсы кіруючых партыйных работнікаў пры ЦК ВКП(б). Пасля працуе ў апараце ЦК КП(б)Б інструктарам сельскагаспадарчага аддзела, а потым— загадчыкам сектара аддзела кадраў ЦК КП(б)Б. З красавіка 1940 года тав. Папоў працуе другім сакратаром Беластоцкага абкома КП(б)Б.

* * *

З Філіпам Іосіфавічам часта па душах вядуць гутаркі калгаснікі, рабочыя соўгасаў і МТС, працоўныя-аднаасобнікі, сустракаючы яго ў сельсовеце, у праўленні калгаса, на сваіх агульных сходах. На пастаўленыя пытанні калгаснік, працоўны селянін заўсёды ад яго атрымлівае пераканаўчы адказ, параду, дапамогу ў вырашэнні ўзнікшых пытанняў. Філіп Іосіфавіч цесна звязан у сваёй рабоце з працоўнымі масамі, чула прыслухоўваецца да іх голасу, верна служыць свайму народу, вялікай партыі Леніна — Сталіна.

Прайшоўшы вялікую школу жыцця, перамагаючы пазбаўленні і нягоды, рашуча змагаючыся з ворагамі партыі і совецкага народа, высока трымаючы званне члена комуністычнай партыі, настойліва працуючы над павышэннем сваіх тэарэтычных ведаў, Філіп Іосіфавіч заслужана карыстаецца аўтарытэтам у партыйнай арганізацыі і сярод працоўных нашай вобласці. Сход інтэлігенцыі горада Ломжы вылучыў яго сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па 16-й выбарчай акрузе. Перадвыбарчы сход гэтай акругі ў асобе прадстаўнікоў — лепшых людзей вытворчасці, стаханаўцаў і інтэлігенцыі аднадушна падтрымаў яго кандыдатуру, заклікаючы выбаршчыкаў 16-й акругі аддаць свае галасы за дастойнага сына народа.

Філіп Іосіфавіч Папоў з чэсцю апраўдае давер'е народа.

Г. Кузняцоў.

Выбаршчыкі Скідэльскай выбарчай акругі № 86! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Рэгіну КАПЛАН!

★ ★ ★

Рэгіна Каплан (Зося Львоўна Цытрын)

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

...Трывожны, падаўлены настрой у горадзе. Па апусцеўшых вуліцах вядуць іх скованымі ў кайданы. Адна жанчына і восем мужчын, акружаных дзесяткам узброеных паліцэйскіх.

...Палявы суд. Прыехалі тузы міністэрства ўнутраных спраў, прыбыў обершпік беластоцкай дэфензівы Высакінскі. Суд падрыхтаван адпаведным загадам урада, а пракурор гаворыць павольна, выразна:

— Патрабую смяротнага пакарання для абвінавачваемых.

...Паблядне́ў твар Рэгіны. Так у яе заўсёды, калі ў душы бура гневу. Вочы глядзяць проста, цвёрда. Цяпер яна ўжо не адчувае болі ад доўгіх катаванняў у дэфензіве, калі яе вешалі галавой уніз, калі падсоўвалі жалезныя палкі пад калены, утыкалі брудную трапку ў рот, лілі ваду праз нос і білі, бясконца білі...

Цяпер трэба сказаць пра тое, што яна абмяркоўвала ў доўгія гадзіны турэмнага адзіноцтва, пра тое, за што яна змагалася ўсё жыццё.

І Рэгіна гаворыць, гаворыць аб геройскай барацьбе змучаных беларускіх сялян. Яна раз'ясняе адносіны рэволюцыйнага пролетарыята да ўзброенага паўстання, да вызваленчай барацьбы зняволеных народаў, яна гаворыць аб зверскім тэроры турэмных катаў і выражае сваю нянавісць суду.

— Які-б ня быў прыгавор суда я веру ў перамогу працоўных!

Бізуном хлесталі гэтыя словы па суддзях, па пракурорах, па ўсёй паліцэйскай бандзе. Але абурэнне рабочых і сялян усёй Польшчы супроць злачынства, якое рыхтавалася ў Кобрыне, было надта вялікім. Палявы суд быў прымушан перадаць справу Рэгіны Каплан у звычайны суд, а астатніх прыгаварыў да пажыццёвага зняволення. Дэфензіва, не задаволеная такім вынікам, хацела Рэгіну забіць з-за вугла, але і гэта не ўдалося! Суд прыгаварыў яе да 15 год турэмнага зняволення.

Такой была Рэгіна, якая ў глухую ноч у вясковых хатах у Сіліччы расказвала сялянам аб вялікай справе Леніна—Сталіна. Тая самая Рэгіна, пераапранутая ў бедную сялянскую вопратку, прабіралася ноччу праз снежныя сугробы ў лясах Пружаншчыны, каб арганізавана кіраваць забастоўкай лясных рабочых 40 вёсак. Тая самая Рэгіна паднімала сялян Брэстчыны на масавыя выступленні для падтрымання барацьбы рэволюцыйных сялян у Заходняй Галіцыі.



Духам пролетарскага інтэрнацыяналізма, духам комунізма было пранікнута ўсё яе жыццё. Сапраўднае прозвішча Рэгіны Каплан—**Цытрын** Зося Львоўна. Нарадзілася яна ў 1908 годзе ў Лодзі ў мяшчанскай сям'і; сумесна з усёй сям'ёй выехала ў час імперыялістычнай вайны ў Расію. 10-гадовай дзяўчынкай яна сустракае Вялікую Кастрычніцкую рэволюцыю ў мястэчку Сураж, Гомельскай губерні, а ва ўзросце 15 год уступае ў комсамол. З гэтага часу ўсё яе свядомае жыццё звязана са справай Леніна—Сталіна.

У 1932 годзе мы бачым Рэгіну інструктарам ЦК КПЗБ, а затым сакратаром акруговага камітэта ў Вільне. Пасля яна пераязджае ў Беласток, арганізоўвае нелегальную партыйную школу, праводзіць усебаковую прапагандысцкую агітацыйную работу сярод беластоцкіх рабочых, дапамагае ў падрыхтоўцы да ўсеагульнай забастоўкі тэкстыльшчыкаў, піша абшырны зварот да рабочых па даручэнню партыйнай арганізацыі. 1933 год сустрэў Рэгіну на Брэстчыне. Гэта самы актыўны перыяд у яе дзейнасці. Ён працягваецца аж да яе арышту.

Рэгіна прайшла цэлае пекла катаванняў у дэфензіве і турме. Доўгія годы пражыла яна за кратамі Брэсцкай, Сядлецкай, Форданскай і Равіцкай турмаў.

Любяць яе рабочыя і сяляне. Рэволюцыйныя рабочыя ў Седлецах, даведаўшыся, што паліцыя будзе перавозіць Рэгіну Каплан у Варшаву, селі ў поезд, рыхтуючыся да таго, каб яе вырваць з рук катаў. Але гэта спроба не ўдалася.

У момант, калі разрываліся снарады ў асаджанай Варшаве, куды яна трапіла прама з турмы, Рэгіна думае аб тым, каб сканцэнтраваць сілы рэволюцыянераў і дзейнічаць.

Увесь час погляды яе былі звернуты на ўсход. А калі гэта толькі стала магчымым, Рэгіна сумесна з другімі палітзняволенымі звяртаецца на нашу соцыялістычную радзіму.

І тут, у совецкім Беластоку, яна зноў прыступае да работы—кіруе беластоцкай абласной арганізацыяй МОПР. Беластоцкая абласная арганізацыя МОПР налічвае сёння ў сваіх радах 40 тысяч членаў рабочых, сялян, працоўных інтэлігентаў.

Нямала яшчэ Рэгіна можа зрабіць і несумненна зробіць на карысць працоўных. Рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя Скідэльшчыны, вылучаючы Рэгіну Каплан кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета, упэўнены, што яна апраўдае іх давер'е.

С. Натансон.

Выбаршчыкі Фабрычнай выбарчай акругі № 3, горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Сцепаніду Васільеўну ЖЫЎЛЮК!

★ ★ ★

Сцепаніда Васільеўна Жыўлюк

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Летам 1925 года з поезда, які толькі што прыбыў на Беластоцкі вакзал, вышла, няўпэўнена аглядваючыся на ўсе бокі, маладая дзяўчына. З выгляду ёй было 15 год. У цяжкім раздум'і яна затрымалася на прывакзальнай плошчы.

Сцепаніда Васільеўна Жыўлюк нарадзілася ў вёсцы Ёдзічы, Крынкаўскага павета. Як адна з многіх тысяч сялянскіх дачок, гнаная нястачай і голадам, яна была прымушана пакінуць родную вёску і паехаць у горад на пошукі заработку.

Ні кавалачка зямлі не было ў бацькі Сцепаніды, вясковага пастуха. Рана Сцепаніда страціла маці. На яе ўтрыманні як у старэйшай асталося трое дзяцей. Як-жа іх пракарміць, іх і сябе?

У гэтыя цяжкія часы адзіная магчымасць для сялянскай дзяўчыны атрымаць работу — гэта пайсці працаваць у якасці прыслугі. Сцепаніда ў горадзе нікога тады не ведала. Пасля трох дзён бесперапынных пошукаў дзяўчыне «пашчаслівілася» паступіць дамашняй прыслугай у сям'і адваката. У кватэры— 7 пакояў. Трэба мыць бялізну для ўсёй сям'і. Цяжка 15-гадовай дзяўчыне, не пад сілу! Але іншага выхаду няма. Зробленыя грошы Сцепаніда рэгулярна пасылае ў вёску на ўтрыманне сваёй сям'і.

Пяць год служыла Жыўлюк у адваката. Увесь час яна імкнецца трапіць на фабрыку. У 1930 годзе ёй удалося паступіць сезонніцай на фабрыку Шмідта. За першыя заробленыя грошы Сцепаніда паставіла свайму майстру тарэлкі, інакш яе выкінулі-б з работы.

Яна працавала тады на фабрыцы ўсяго 2—3 месяцы ў год у жудасных умовах лютай эксплаатацыі. Астатнія месяцы года прыходзілася зноў шукаць службу ў багатых беластоцкіх дамах. Але не заўсёды можна было знайсці такую работу. Праходзілі доўгія месяцы беспрацоўя і голаду.

У 1934 годзе Жыўлюк атрымала работу на прадзільнай фабрыцы Кнышынскага (зараз гэта фабрыка ўваходзіць у састаў 1-га тэкстыльнага камбіната) у якасці вінтаўшчыцы.

У маладой работніцы вельмі рана прачнулася класавая самасвядомасць. Яна ўпэўнена ў сіле свайго класа і заўсёды належала да тых, якія не давалі сябе запалохаць ніякімі пагрозамі фабрыкантаў. Аднойчы на фабрыцы Кнышынскага ўзнік канфлікт з-за адпускных.

— Калі не адступіце ад сваіх патрабаванняў, то зусім зачыню фабрыку,—нагла заявіў фабрыкант рабочым.



Некаторыя работніцы запалохаліся, яны ўжо ведалі, што гэта значыць беспрацоўе. Але Жыўлюк належыць да тых, якія не баяцца барацьбы з эксплаататарамі. Яна загітавала астатніх работніц, і канфлікт закончыўся перамогай рабочых. Фабрыкант быў прымушан выплаціць адпускныя.

У верасні мінулага года прыйшла вялікая перамена. У Беластоку ўстаноўлена совецкая ўлада, праведзена нацыяналізацыя фабрык і адначасова адкрылася новая старонка ў жыцці Сцепаніды Васільеўны Жыўлюк. Яе бацька атрымаў 8 гектараў зямлі, дом, карову.

Праца на фабрыцы, на якой няма ўжо эксплаататараў стала радасцю, справай доблесці, чэсці і геройства. Добра жывецца пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, і Жыўлюк поўна гарачага імкнення выразіць сваю глыбокую ўдзячнасць сваёй новай радзіме. Яна — адна з першых на прадпрыемстве пераходзіць на ўшчыльненую работу і замест 500 верацён абслугоўвае тысячу.

Жыўлюк прымае вялікі ўдзел у грамадскай рабоце. Яна з'яўляецца старшынёй цэхкома, членам культкамісіі, камісіі па зарплаце, членам рэвізійнай камісіі фабкома, нарзасядацелем суда.

Цэлы месяц, з паловы жніўня да паловы верасня 1940 года, нарзасядацель Жыўлюк з поспехам працавала намеснікам нарсуддзі 6-га ўчастка гор. Беластока. Яна разглядала разнастайныя справы, судзіла прагульшчыкаў, летуноў, хуліганаў. Жыўлюк вельмі добра справілася з сваімі абавязкамі.

Цікава адзначыць, што паміж адвакатамі, якія выступалі перад намеснікам нарсуддзі тав. Жыўлюк, можна было сустрэць і таго адваката, у якога яна калісьці служыла 5 год.

Сцепаніда Васільеўна карыстаецца велізарным аўтарытэтам на сваім камбінаце. І таму іменна калектыў прадпрыемства вылучыў яе кандыдатам абласнога Совета дэпутатаў працоўных. У дзень выбараў усе выбаршчыкі як адзін аддадуць за яе свае галасы.

В.Бемаў.

Выбаршчыкі Слабадской выбарчай акругі № 6, горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Зігізмунда Пятровіча КАЕЎСКАГА!

★ ★ ★

Зігізмунд Пятровіч Каеўскі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

У сакавіцкія дні 1933 года, калі ў Беластоку пачалася ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў, ткач Зігізмунд Каеўскі быў беспрацоўным: заправілы фабрыкі Ольяна зволілі яго за актыўную работу ў профсаюзе. Ён не працаваў ужо некалькі месяцаў.

Тры месяцы працягвалася забастоўка. Яшчэ тры месяцы не працаваў ткач Каеўскі. Рабочыя, іх жонкі прадавалі апошнюю вопратку, усяляк дапамагалі адзін другому. Не зламаў волі рабочых і паліцэйскі тэрор...

Зігізмунд Пятровіч прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх забастоўках на фабрыцы. Ён заклікаў рабочых і работніц да актыўнай барацьбы з польскімі капіталістамі. З'яўляючыся членам профсаюза тэкстыльшчыкаў з 1919 г., ён тры годы актыўна працаваў членам праўлення гэтага саюза.

— Ёсць што прыпомніць, — расказвае тав. Каеўскі. — Нямала здзекваліся паны над рабочымі, асабліва над актывістамі. Але лепш-бы аб старым не ўспамінаць. Не люблю гаварыць пра перажытыя пакуты. Лепш паслухайце пра тое, як мы радаваліся ў вераснёўскія дні 1939 года, як мы сустракалі нашу доўгачаканую родную Чырвоную Армію, як мы жывём і працуем зараз.

І тав. Каеўскі расказаў нам пра сваё шчасце, што прышло ў верасні 1939 года, пра сваё новае жыццё, пра шчаслівае сёння і яшчэ больш шчаслівую будучыню.

* * *

Зігізмунд Пятровіч Каеўскі, паляк па нацыянальнасці, нарадзіўся ў Беластоку ў 1897 годзе. Як і яго бацька, ён з малых год пачаў работу на тэкстыльных прадпрыемствах. З 1925 года, калі не лічыць



перапынкаў па беспрацоўю, працуе на адным прадпрыемстве — на беластоцкім тэкстыльным камбінаце № 5 (былая фабрыка Ольяна).

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ад памешчыкаў і капіталістаў тав. Каеўскі працуе ў ткацкім цэху ў якасці ткача і адначасова выконвае вялікую грамадскую работу. Ён выбіраецца старшынёй фабрычна-кантрольнай камісіі. Па яго ініцыятыве на працягу некалькіх дзён ліквідуецца запазычанасць па зарплаце рабочым, якую стварыў фабрыкант. У тыя-ж дні ім разам з іншымі рабочымі добра была наладжана ахова фабрычнай маёмасці. Потым яго вызначылі старшынёй камітэта па нацыяналізацыі фабрыкі. І на гэтай рабоце ён з чэсцю апраўдаў давер'е рабочых, давер'е Часовага гарадскога ўпраўлення.

У лютым 1940 года тав. Каеўскі, як адзін з лепшых рабочых, як адзін з лепшых актывістаў, вылучаецца на пасаду намесніка начальніка ткацкага цэха.

З пачуццём адказнасці за даручаную справу ён бярэцца за кіруючую работу ў цэху. Праводзіць вялікую масава-палітычную работу сярод рабочых і работніц. Каля ста чалавек ахоплена тэхнічнай вучобай. І як вынік — цэх з месяца ў месяц выконвае і перавыконвае план. Зараз у цэху сярод ткачоў — 50 стаханаўцаў, сярод мотальшчыц — 20 стаханавак.

Цяпер Зігізмунд Каеўскі вылучан кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных і зарэгістрыраван па Слабадской выбарчай акрузе № 6.

15 снежня выбаршчыкі 6-й выбарчай акругі Беластока аднадушна аддадуць за яго свае галасы.

В. Дзямянаў.

Шырэй размах агітацыйна-масавай работы на выбарчых участках!

У ПАЛОНЕ САМАЦЁКУ

ВАЎКАВЫСК. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). З самага пачатку выбарчай кампаніі ў Ваўкавыскім раёне назіраўся самацёк і неарганізаванасць: рабілі адно — забывалі пра другое. Недахопы першых дзён у выбарчай кампаніі былі поўнасцю ўскрыты раённым партсходам. Сход патрабаваў ад кампартаў і кіруючых работнікаў раёна арганізаваць бальшавіцкую работу па падрыхтоўцы да выбараў.

Прайшло 20 дзён пасля схода, а становішча ніколькі не змянілася. Ні на адным з выбарчых участкаў горада, за выключэннем Школьнага № 12, ніякай работы не праводзіцца. Старшыня Ленінскага выбарчага ўчастка № 10 тав. Паўленка не патурбаваўся правесці пасяджэнне камісіі, скласці план работы, размеркаваць абавязкі сярод членаў камісіі, атрымаць у горсовеце спіскі выбаршчыкаў і вывесціць іх. Ён не пабываў нават на выбарчым участку.

У памяшканні гарадской санстанцыі размешчаны Савецкі выбарчы ўчастак № 2, але тут не закончан рамонт і заканчваць яго не спяшаюцца. Выбарчая камісія на чале з тав. Усачовым не прыступіла да работы і не ведае, што робіцца на ўчастку.

Выбаршчыкі Ленінскага выбарчага ўчастка № 13 жадаюць зайсці на свой участак праверыць сябе ў спісках, але дарэмна—участковая камісія не прыступае да работы і спіскаў выбаршчыкаў да 14 лістапада ніхто не вывешваў.

У пастанове раённага выканаўчага камітэта аб утварэнні выбарчых участкаў указана, што Першамайскі выбарчы ўчастак № 1 размешчан па Першамайскай вуліцы, у доме № 8. На справе-ж, участак знаходзіцца ў памяшканні № 11. Выбаршчыкі абіваюць парогі жыхарам дома № 8 і «добрым» словам успамінаюць тых, хто падпісаў пастанову.

Горвыканкам з халадком аднёсся да работы па складанню спіскаў выбаршчыкаў. Спіскі распачалі складаць з вялікім спазненнем. І яны не былі вывешаны да 14 лістапада, а патрэбна было вывешваць, згодна Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, 10 лістапада.

Д. Казлоў.

ШЫРОКАЯ ПЕРАДВЫБАРЧАЯ РАБОТА

З кожным днём усё шырэй разгортваецца перадвыбарчая работа ў Цэбаргалецкім сельсовеце, Замбраўскага раёна. 13-ю гурткамі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах, якія арганізаваны ў вёсках, ахоплены ўсе выбаршчыкі. У састаў агітатараў падабран лепшы актыў сельсовета.

Добра вядзе агітацыйную работу настаўніца Цэбаргалецкай пачатковай школы тав. Клімовіч. Актыўна працуе з выбаршчыкамі вёскі Капусты агітатар тав. Калакоўскі. На кожных занятках яго гуртка прысутнічае па 40—50 чалавек.

Сельсовет саставіў ужо спіскі выбаршчыкаў. Рыхтуюцца лозунгі і спецыяльны нумар насценгазеты, прысвечаны выбарам.

К. Грамакоўскі.

На выбарчых участках горада Ломжы

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных па гораду Ломжы праходзіць паспяхова. Усе 13 участковых выбарчых камісій прыступілі да работы. На выбарчых участках вывешаны спіскі выбаршчыкаў. Арганізавана 160 гурткоў, 3.600 выбаршчыкаў ахоплены вывучэннем Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На выбарчых участках працуе каля 300 агітатараў.

Асабліва актыўна ўключылася ў работу на выбарах участковая выбарчая камісія 2-га ўчастка (15-я выбарчая акруга). Старшыня гэтай камісіі тав. З. І. Ваўчкова арганізавала дзяжурствы членаў выбарчай камісіі і добра абсталявала памяшканне. Знадворку і ўнутры памяшкання многа лозунгаў, прысвечаных выбарчай кампаніі, ёсць дастатковая колькасць літаратуры па розных пытаннях выбарчай кампаніі. У памяшканні выбарчай камісіі заўсёды многалюдна. Тут выбаршчык можа атрымаць адказ на любое пытанне, якое яго цікавіць.

Добра працуе ўчастковая выбарчая камісія 3-га выбарчага ўчастка (17-я выбарчая акруга). Старшыня гэтай камісіі тав. В. І. Берг прыцягнуў да работы ўсіх членаў камісіі.

Аднак некаторыя ўчастковыя камісіі вельмі марудна разгортваюць работу. Да такіх можна аднесці камісію выбарчага ўчастка № 2, 16-й выбарчай акругі (старшыня тав. А. В. Бейненсон), камісію выбарчага ўчастка № 3, 15-й выбарчай акругі (старшыня тав. М. А. Эпштэйн).

Е. Крэснікаў.

Выбарчая кампанія ў Аўгустоўскім раёне

З вялікай радасцю сустрэлі працоўныя Аўгустоўскага раёна выбарчую кампанію на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Шырока разгорнута агітацыйна-масавая работа. Наглядаецца вялікі выбарчы і палітычны ўздым. Працоўныя імкнуцца азнаменаваць выбары ў мясцовыя Советы завяршэннем вытворчых планаў, выкананнем усіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Сяляне вёскі Язеркі, Усцянскага сельсовета, сустрэлі пачатак выбарчай кампаніі 100-працэнтным выкананнем бульбапаставак. Поўнасцю выканаў бульбапастаўкі Аўгустоўскі сельсовет (старшыня сельсовета тав. Калашнікаў).

Рабочы калектыў лесапільнага завода № 2 (дырэктар завода — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Рышкевіч) адзначыў пачатак выбарчай кампаніі выкананнем на 108 працэнтаў гадавога вытворчага плана.

У раёне створаны і зацверджаны 373 выбарчых камісіі. У састаў выбарчых камісій сходамі працоўных вылучаны 1433 лепшых актывіста, сярод іх 391 жанчына, 130 рабочых, 905 сялян, 398 служачых.

У абстаноўцы незвычайнага адзінадушша і маральна-палітычнага адзінства грамадзяне Аўгустоўскага раёна вылучалі кандыдатаў у дэпутаты абласнога і раённага Советаў дэпутатаў працоўных.

Кандыдатамі ў дэпутаты раённага Совета на сходах працоўных вылучаны 45 лепшых прадстаўнікоў працоўных, сярод іх 20 членаў і кандыдатаў камуністычнай партыі і 25 беспартыйных.

Шырокую масава-палітычную работу на выбарчых участках разгарнулі агітатары. Гурткамі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах кіруюць 280 агітатараў.

Працоўныя Аўгустоўскага раёна рыхтуюцца да дня выбараў з найвялікшай радасцю, дэманструючы сваю гатоўнасць аддаць галасы за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Ф. Масанін,
загадчык оргінструктарскім аддзелам Аўгустоўскага райкома КП(б)Б.



У беластоцкім Доме партасветы. Кансультант М. А. Хмельніцкая кансультыруе агітатараў фабрык.

На здымку (злева направа): А. А. Максімлюк, А. А. Завадскі (15-я фабрыка), Х. Я. Кантаровіч (32-я вацінна-ватная фабрыка), М. А. Хмельніцкая.

Фота А. Сапіра.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ Ў ДЭПУТАТЫ СЕЛЬСКІХ СОВЕТАЎ

АЎГУСТОЎ. (Па тэлефону). У Аўгустоўскім раёне ідзе вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты сельсоветаў. Сярод вылучаных па Аўгустоўскаму сельскаму Совету Елена Францаўна Францавіч, 1911 года нараджэння, полька, па соцыяльнаму паходжанню — сялянка-батрачка, аднаасобніца.

У Чырвонаборскі сельскі Совет вылучан Карл Антонавіч Гараноўскі, 1897 года нараджэння, паляк, з сялян вёскі Чырвонаборкі. Актыўна ўдзельнічаў у рабоце сельсовета.

Таксама вылучана Соф'я Валенцінаўна Шыберова, 1905 года нараджэння, полька, беспартыйная, з рабочых, дырэктар няпоўнай Чырвонаборскай сярэдняй школы.

Калгаснікамі калгаса імені 17 верасня вылучана Яніна Адамаўна Град, 1918 года нараджэння, па нацыянальнасці полька, з сялян-батракоў. Да прыходу Чырвонай Арміі батрачыла ў пана. Цяпер ударніца калгаса імені 17 верасня.

* * *

ЗАБЛУДАЎ. (Па тэлефону). Кандыдатам у дэпутаты пасялковага Совета Міхайлава рабочым калектывам 9-га тэкстыльнага камбіната вылучан Нікалай Андрэевіч Буро, 1912 года нараджэння, беларус, рабочы 9-га тэкстыльнага камбіната, беспартыйны. Тав. Буро прымае актыўны ўдзел у рабоце пасялковага совета.

Агульным сходам сялян вёскі Баранкі, Дарожкаўскага сельсовета, вылучан кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета Віктар Іванавіч Матэйчук, 1895 года нараджэння, беспартыйны, паляк, з сялян, аднаасобнік, прымаў актыўны ўдзел у грамадскай рабоце, быў ушанаваны жаным вёскі па нарыхтоўках сельскагаспадарчых прадуктаў.

У Міхайлоўскі сельскі совет вылучаны: Сак Марыя Сцяпанаўна, 1907 года нараджэння, беларуска, з сялян, цяпер калгасніца калгаса імені Сталіна, беспартыйная; Бельская Марыя Паўлаўна, 1912 года нараджэння, беларуска, з сялян, калгасніца калгаса імені Молатава, вылучана калгаснікамі калгаса імені Молатава, Міхайлоўскага сельсовета.

Па Агародніказскаму сельскаму совету ад сялян вёскі Трэсцяніцы вылучан Владзімір Карнілавіч Якаўчук, селянін-бядняк, беларус, аднаасобнік.

* * *

НАРЭЧЧА. (Па тэлефону). 13 лістапада на агульным сходзе сялян вёскі Новая Руда вылучылі 6 чалавек кандыдатамі ў дэпутаты сельскага Совета дэпутатаў працоўных. Вылучаны: Люба Фамінічна Янковіч, беларуска, сялянка вёскі Бабіна; Марыя Кузьмінічна Коха — сакратар Новагрудскага сельсовета, беларуска; Станіслаў Нікалаевіч Русілка; Серафім Вікенцьевіч Песнюк, з рабочых, цяпер працуе на сельскай гаспадарцы ў вёсцы Новая Руда; Аляксандр Нікіфаравіч Жук, у мінулым селянін-бядняк, зараз старшыня сельсовета.



Оргбюро беластоцкага аддзялення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі. Злева направа: тт. Смоляр, Максім Танк, Філіп Пестрак, Яніна Бранеўская, Міхась Лынькоў, Эфроім Каганоўскі і Сфард.

Фота А. Сапіра.

Творчасць пачынаючых

Ніжэй мы друкуем вершы дасюль невядомых паэтаў нашай вобласці.

Адзін з іх—Сяргей Крывец—цяпер студэнт Беластоцкага педагагічнага інстытута. Перанёсшы на сваіх плячах цяжар буржуазнага прыгнёту, ён напісаў нямала вершаў аб выключна цяжкім жыцці працоўных у былой панскай Польшчы. Да гэтага часу ён нідзе не друкаваўся.

Другі—Міхаіл Куклінскі—селянін вёскі Зверкі, Заблудаўскага раёна. Друкуемы намі верш «Пой, ликуй, страна Советов» напісан у сувязі з XXIII гадавінай Вялікага Кастрычніка.

Вершы Міхаіла Куклінскага і Сяргея Крыўца адлюстроўваюць характэрны контраст мінулага і сучаснага ў жыцці працоўных нашай зямлі.

Михаил КУКЛИНСКИЙ

Пой, ликуй, страна Советов!

Пой, ликуй, страна Советов,
От края до края,
Двадцать третье свое лето
Радостно встречая.
Вспомни годы войн кровавых
И трудов тяжелых,
Чтоб сегодня встретить
с славой
Этот день веселый.
Сам народ страною правит,
На себя трудится,
И теперь есть с чем поздравить,
Есть чем похвалиться.
Мы советские народы —
Нам пределов нету,
Изменяем мы природу
На диво всему свету.
Мы колхозы создавали,
Строили заводы,
Мы и полюс открывали
Ночью в непогоды.
Мы моря соединили,
Мы каналы рыли,
Мы болота осушили,
Реки запрудили.
Нам титаны пароходы
И орлы стальные
Охраняют наши воды —
Рубежи родные,
Чтобы мирно мы трудились,
Чтоб войны не знали,
Чтоб народы к нам стремились
И с близи и с дали.
Рига, Каунас и Талин —
Юных три столицы —
С нами тоже пожелали
Навеки сроднитъся.
Бессарабия вернулась
На отчизны лоно,
Буковина потянулась
За страной червонной.
Пусть земля кругом клокочет
Страшною войною, —
Наш Союз всегда быть хочет
Мирною страною.
Но коль враг какой посмеет
Мир наш потревожить,
Наш народ всегда сумеет
Врага уничтожить.

1940 год, д. Зверки.

Сяргей КРЫВЕЦ

ДУМКІ

Ночка чорным пакрывалам
Мне акно завесіла.
У хаце холад. (Дроў замала).
На душы не весела.
Мо' паесці? Што-ж і трэба,
Думка — не гарэзія.
Соў, падумаў. (Скуль узяць
хлеба?)
Эх, жыццё, — паэзія.
Цяжка й дарма. Але веру,
Возьмем цябе прозаю.
Стаў пісаць, — (няма паперы)
Думкі не цвярозыя.
Ёсць кавалак (з сінім штампам)
Стоп. Тут штосьці знаёмае.
Стаў чытаць. (Пагасла лямпа)
Справа трыццаць сёмая...
Сліміць дождж. На панадворку
Ноч у гразі палошчацца.
Закурыць (была-б махорка!)
Неяк надта хочацца.
Пераграс усе кішэні.
Ціха, назбіраецца!
Пацягнуў, (адны карэні),
Чад клубком качаецца.
Сыплюць думкі, сыплюць мроі,
Іскрамі з-пад крэсіва.
Прыйдзе час (і мы героі!)
Ну, і гульнём-жа весела.

г. Беласток, 1936 г.

Гераічныя старонкі мінулага

БАРАЦЬБА КРЫНКАЎСКІХ КАЖЭВНІКАЎ СУПРОЦЬ СВАІХ ЭКСПЛААТАТАРАЎ

Невялікі жывапісны гарадок Крынкі размешчан у 60 кілометрах ад Беластока і на такой-жа адлегласці ад Гродна. У Крынках знаходзіцца вядомыя скураныя заводы. Гэтае месца яшчэ з даўніх часоў славілася вытворчасцю скураных тавараў.

Пачынаючы з 70-х гадоў мінулага стагоддзя, тут хутка стала расці скураная прамысловасць, пачалі паяўляцца гаспадары маленькіх скураных заводаў з невялікай спачатку колькасцю рабочых. К канцу 90-х гадоў тут ужо было каля 14 заводаў, на некаторых з іх працавала звыш 100 чалавек. К пачатку першай рускай рэволюцыі 1905—1907 гг. колькасць рабочых значна павялічылася. Сюды сцякаліся наймацца на работу беларусы і яўрэі з Беластока, Віцебска, Гомеля і Бердычава.

50-галовая гісторыя крынкаўскіх скураных заводаў поўная шматлікімі рэволюцыйнымі эпізодамі класавай барацьбы. Рабочыя згаліся супроць катаржных умоў працы. Яны тайна збіраліся ў лясах у 3-х кіламетрах ад Крынак і праводзілі там сходы. Не раз паліцыя праследвала рабочых і разганяла іх сходкі; многія пападалі ў турму.

У 1897 г. крынкаўскія рабочыя правялі дзве забастоўкі, першую ў чэрвені, а другую—у верасні. Рабочыя Крынак мелі цесную сувязь з рабочымі суконных фабрык і паравых вонтапрадзілак гор. Беластока. Беластоцкія рабочыя падтрымлівалі крынкаўскіх рабочых, сабіралі для іх грошы. Баставаўшыя рабочыя Крынак выставілі патрабаванні, каб рабочы дзень быў зменшан да 10 гадзін, каб усе майстры і рабочыя атрымлівалі плату не здзельную, а кожны тыдзень, незалежна ад колькасці выпрацаванага тавару. Рабочыя дагаварыліся паміж сабой, каб у выпадку найму другіх рабочых,—не дапускаць іх да працы. Заводчыкі адмовіліся задаволіць патрабаванні рабочых і наймалі рабочых з другіх губерань. У сувязі з тым, што паміж баставаўшымі рабочымі і штрэйкбрэхерамі адбываліся бойкі, была выклікана і раскватаравана ў Крынках рота салдат. Толькі такім чынам удалося сарваць забастоўку.

Наступная, вялікая па сваіх размерах, забастоўка, якая працягвалася амаль 7 тыдняў, пачалася ў чэрвені 1900 года. Рабочыя патрабавалі скарачэння рабочага дня і павелічэння заработнай платы. Рабочыя прысягнулі, што будуць баставаць да таго часу, пакуль не задаволяць іх патрабаванняў. У сваім прашэнні на імя гродненскага губернатара яны раскрываюць невыбаную эксплаатацыю рабочых і жахлівыя ўмовы працы.

У чэрвені таго-ж года пісалі рабочыя Крынак: «Мы баставалі і не выходзілі на работу амаль 7 тыдняў. За гэты час прышлося перанесці многае, бо сядзелі без заработку. Наша стачка была выклікана нясцерпнымі ўмовамі працы. Па закону мы павінны працаваць 13 гадзін у дзень, а нас прымушалі працаваць па 14, 15 і больш гадзін. Працоўныя кніжкі павінны быць пры нас, а іх заўсёды затрымлівалі ў канторах і выдавалі толькі тады, калі гаспадары давецаюца, што павінна прыехаць начальства. Нам адказваюць у рабоце, не паляродзізушы, як гэтага закон патрабуе.

На нас накладваюць незаконныя штрафы і наогул вялікае прыцясненне ад гаспадара і майстраў. Памяшканні для працы цесныя і брудныя ў выніку адсутнасці усякіх санітарных прыстасаванняў. Рабочыя часта хварэюць страшнай хваробай—сібірскай язвай. Аб усім гэтым было даклада вядома старшаму фабрычнаму інспектару пану Варанцову, якому мы неадназаова скардзіліся. Але ён дзейнічаў ва ўгоду нашых гаспадароў, а нашы просьбы аставіў без усякай увагі. Таму мы былі вымушаны баставаць, каб шляхам забастоўкі палепшыць наша жыццё. Але наша становішча не палепшылася, і мы далей не можам цярпець. Мы звяртаемся да вашага правасхадзіцельства з просьбай звярнуць увагу на нашы скаргі і зрабіць распараджэнні, каб гэтага беззаконня былі знішчаны. Калі-ж вы не акажаце нам законнага садзейнічання, то нястача прымусіць нас зноў прыбегнуць да стачкі. Іншага выхаду мы не бачым. Нам прыдзецца змагацца, і гэта барацьба будзе на жыццё і на смерць. Нам усё роўна нечага траціць. Жадаючы назбегнуць усякіх крайнасцей, мы звяртаемся да вас, маючы надзею, што вы настоіце, каб закон ва ўверанай вам губерні захоўваўся».

Усе сродкі былі пушчаны ў ход, каб рабочыя прыступілі да работы. Фабрычныя інспектары прабавалі ўгаварыць рабочых пачаць працаваць, але выехалі, нічога не дабіўшыся ад рабочых. Пасля іх ад'езду некалькі рабочых было арыштавана. Рабіні выклікаў рабочых яўрэяў да сябе і таксама ўгаварваў іх прыступіць да работы. У канцы канцоў заводчыкі рашылі зрабіць рабочым уступку. Рабочыя выйгралі гэтую забастоўку. Але часовыя поспехі рабочых затым хутка знішчаліся гаспадарамі-эксплаатататарамі і ўсё асталася па-старому.

Набліжалася першая руская рэвалюцыя. Вестка аб расстрэле мірных пецербургскіх рабочых стала хутка вядома і крынкаўскім рабочым. 17 студзеня рабочыя ў знак пратэсту кідаюць работу. У гэты дзень адбыўся мітынг, на якім рабочыя абмяркавалі зладзейскі паступак царызма. Пасля мітынга рабочыя ўшэрывшю вышлі адкрыта з чырвонымі сцягамі. У страху перад рэволюцыйна настроенымі рабочымі справнік і паліцэйскія ледзь паспелі ўцячы. Рабочыя ў справніцкае знішчылі ўсе дакументы ў канцылярыі. Царскія партрэты былі аддадзены публічнаму расстрэлу і знішчаны.

Тое-ж самае было зроблена ў Крынкаўскай воласці. Тэлефонная сувязь была перарэзана. Рабочыя разбілі казённыя лаўкі, якія гандлявалі гарэлкай, пры гэтым, згодна загада, рабочыя гарэлку не бралі. На заўтрашні дзень рабочыя пастанавілі адабраць аружжа ў чыноўнікаў, заводчыкаў і ксяндзоў, што было хутка праведзена ў выкананне. За гэты час паліцэйскі ганец паведаміў у мястэчка аб беспарадках у Крынках. З Саколкі, дзе ўстанаўлення «парадку» была накіравана рота 63 пяхотнага Углічскага палка. Рота салдат увайшла 18 студзеня 1905 года на Сакольскую вуліцу і была сустрэта рабочымі, жанчынамі і дзецьмі. Рабочыя патрабавалі ад афіцэра, каб ён не рабіў арыштаў. Афіцэр запэўніў рабочых і абяцаў, што арышты не будуць зроблены, і тут-жа аб'явіў, каб усе разыходзіліся. Не паспелі разыйсціся рабочыя па кватэрах, як ужо ўсюды сталі патрулі. Пачаліся масавыя арышты. Здраднікі рабілі сваю агідную справу, указвалі на рабочых, і іх тут-жа арыштоўвалі і саджалі ў падвал. Пасля арыштаваных рабочых са звязанымі рукамі адпраўлялі ў Саколку, а адтуль у турму ў Гродна. Як толькі ў Гродна прыбылі арыштаваныя рабочыя з Крынак, у турме пачаліся «беспарадкі».

Крынкаўскія рабочыя не спынялі рэволюцыйнай барацьбы і пазней. Становішча рабочых асталася амаль без перамен. У былой Польшчы рабочыя таксама не адзін раз баставалі. У 1926 годзе рабочыя скураных заводаў правялі 10-тыднёвую забастоўку. Выстаўленыя рабочымі эканамічныя патрабаванні былі задаволены гаспадарамі. Другая забастоўка тут адбылася ў 1929 годзе. Баставаўшых рабочых паліцыя арыштавала і саджала ў турмы.

Толькі прыход Чырвонай Арміі ў 1939 годзе ў верасні назаўсёды пазбавіў крынкаўскіх рабочых скураных прадпрыемстваў ад гаспадароў-эксплаатататараў, і сумесна з усім беларускім і ўкраінскім народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны яны ўвайшлі, як роўнапраўныя члены, у састаў вялікай сям'і народаў Совецкага Саюза.

Л. Чванаў,
дырэктар Гродненскага філіяла Цэнтральнага гістарычнага архіва.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 15 лістапада. (ТАСС) Афіцыяльна паведамляецца, што ўпершыню з часу пачатку германскіх масавых паветраных налётаў дзеянні германскай авіяцыі ў ноч на 15 лістапада былі накіраваны галоўным чынам супроць Цэнтральнай Англіі. Інтэнсіўная атака была прадпрынята на адзін з гарадоў у Цэнтральнай Англіі, у якім успыхнула многа пажараў, прычыніўшых значны матэрыяльны ўрон. У выніку налётаў на іншыя гарады Цэнтральнай Англіі прычынены пашкоджанні магазінам і жылым будынкам. Чалавечыя афяры невялікія. Некалькі налётаў на працягу ночы было прадпрынята на раён Лондана. Разбурана некаторая колькасць жылых і іншых будынкаў. Ёсць забітыя і раненыя. Германскія самалёты скідвалі таксама бомбы над радам іншых раёнаў Англіі на поўнач ад Уэльса.

Учора звыш 40 германскіх пікіруючых бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Дуўр. 20 англійскіх знішчальнікаў уступілі ў бой з непрыяцельскімі бамбардыроўшчыкамі, якія ляцелі ў суправаджэнні вялікай колькасці германскіх знішчальнікаў. Англійскія знішчальнікі збілі 15 самалётаў праціўніка.

Усяго за ўчарашні дзень збіта 19 непрыяцельскіх самалётаў.

Два англійскіх знішчальнікі загінулі.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў ноч на 15 лістапада англійская авіяцыя зноў падвергла ўзмоцненай бамбардыроўцы ваенныя аб'екты Берліна. Паміма гэтага англійскія эскадрыллі прадпрынялі налёты на прамысловыя прадпрыемствы, размешчаныя ў розных раёнах Германіі, а таксама на многія аэрадромы, якія знаходзяцца на акупіраванай немцамі тэрыторыі.

Налёт Германскай авіяцыі на Ковентры

ЛОНДАН, 15 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што германская авіяцыя падвергла ў ноч на 15 лістапада ўзмоцненай бамбардыроўцы Ковентры (Цэнтральная Англія). Гораду прычынены цяжкія пашкоджанні. Па папярэдніх звестках, афяр налічваецца 1 тысяча чалавек. Ва многіх пунктах пачаліся пажары. Згодна маючыхся даных, у час налёта было збіта па меншай меры два непрыяцельскіх самалёты. (Ковентры — чыгуначны вузел, адзін з буйнейшых цэнтраў аўтамабільнай, авіяцыйнай і авіяматорнай прамысловасці Англіі, цэнтр веласіпеднай прамысловасці).

Стварэнне французскага жаночага дапаможнага корпуса ў Англіі

ЛОНДАН, 15 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што з ліку французскіх жанчын, пражываючых у цяперашні час на тэрыторыі Англіі, будзе створан дапаможны корпус, які будзе аказваць дапамогу войскам генерала дэ Голя. Французскі жаночы корпус будзе выконваць тыя-ж функцыі, што і англійскі дапаможны жаночы корпус, члены якога працуюць у якасці повараў, пісараў, машыністак, шофераў і т. д.

Пагібель французскіх ваенных караблёў

БАРДО, 15 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе з Бардо, што французскае марское міністэрства афіцыяльна пацвердзіла пагібель падводнай лодкі «Панселе». Кананерская лодка «Бугенвіль» атрымала буйныя пашкоджанні ў час баёў ля Лібрэвіля. Каманды гэтых ваенных караблёў захоплены ў палон. Каманда «Бугенвіля» складалася з 14 афіцэраў і 121 матроса. На падводнай лодцы «Панселе» знаходзілася 4 афіцэры і 59 матросаў.

Вайна паміж Грэцыяй і Італіяй

НЬЮ-ЙОРК, 15 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, грэкі пачалі актыўнае наступленне на ўсім працягу албанскай граніцы. Італьянцы адступілі за раку Каламас у некалькіх пунктах. У грэчаскім наступленні прымаюць удзел пяхота, кавалерыя, грэчаскія і англійскія самалёты, горная артылерыя і танкі.

Грэчаская кавалерыя атакавала італьянцаў на паўночны захад ад Яніны. Італьянцы адступілі з першай лініі абароны. Грэчаскія горныя войскі аўладалі важным у стратэгічных адносінах узвышшам вышынёй у 4.500 футаў.

Італьянцы перакінулі вялікую колькасць войск на фронт, спрабуючы затрымаць грэчаскае прасоўванне ў паўднёвай частцы Албаніі. Наглядальнікі мяркуюць, што італьянцы перайшлі ад наступлення да абароны. Бамбардыроўка італьянскіх і албанскіх партоў, праведзеная англійскімі і грэчаскімі самалётамі, перашкодзіла прыбыццю падмацаванняў з Італіі.

Паводле паведамлення з Яніны, грэкі прадаўжаюць прасоўвацца на албанскую тэрыторыю.



Ваенныя дзеянні ў Міжземным моры

НЬЮ-ЙОРК, 15 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, які знаходзіцца з англійскім міжземнаморскім флотам у раёне Таранта, пацвярджае паведамленні аб тым, што англійскія ваеннамарскія бамбардыроўшчыкі пранiклі 11 лістапада за лінію ўнутраных умацаванняў Таранта і скінулі бомбы вялікай узрыўной сілы. Па словах карэспандэнта, лётчыкі бачылі, як успыхнула полымя на італьянскім лінкоры класа «Літорые» водазмяшчэннем у 35 тысяч тон. Былі таксама нанесены пашкоджанні двум іншым лінкорам класа «Кавур». Англійская паветраная разведка пазней выявіла, што лінкор класа «Літорые» усё яшчэ гарыць.

ЛОНДАН, 15 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр прыводзіць наступныя даныя аб караблях італьянскага флота. Італьянскія лінкоры класа «Літорые» маюць водазмяшчэнне 35 тысяч тон кожны і з'яўляюцца найбольш сучаснымі караблямі італьянскага флота. Вядома, што з 4 закладзеных караблёў гэтага тыпу было спушчана на ваду толькі два. Гэтыя два лінкоры былі перададзены італьянскаму флоту ў маі гэтага года. На ўзбраенні лінкора гэтага класа знаходзяцца 24 буйных калібравых гармат, 40 зенітных кулямётаў і інш. Хуткасць карабля, на борце якога знаходзяцца тры самалёты, складае 30 вузлоў. Экіпаж карабля звычайна складаецца з 1.600 чалавек. Лінкораў класа «Кавур» Італія мела 4. Усе яны былі рэканструіраваны ў апошнія годы. Гэтыя лінкоры ўзброены дзесяццю 12,6-дзюймовымі гарматамі і іншай артылерыяй, у тым ліку 39 зенітнымі кулямётамі кожны. Кожны карабель мае 4 самалёты і экіпаж колькасцю ў 1.100 чалавек. Водазмяшчэнне лінкора гэтага класа складае 23.623 тоны.

—o—

ЗАБАСТОЎКА ПАРТОВЫХ РАБОЧЫХ У ФІНЛЯНДЫІ

ХЕЛЬСІНКІ, 15 лістапада. (ТАСС). Газета «Суомен сосіалідэмокраатці» у нумары ад 13 лістапада паведамляе, што ў Піэтарсары (Якобстад) 12 лістапада пачалася забастоўка грузчыкаў мясцовага порта. Рабочыя патрабуюць павышэння заработнай платы. Соцыял-дэмакратычная газета лічыць гэту забастоўку «дзікай», бо яна пачата без дазволу профсаюзаў.

—o—

ЗВОДКА КАМАНДАВАННЯ ГРЭЧАСКАЙ АРМІІ

АФІНЫ, 15 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае камюніке вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, апублікаванае ўвечары 14 лістапада: «На ўсіх франтах адзначалася ажыўленая дзейнасць пяхоты, артылерыі і авіяцыі. Намі захоплена больш 200 палонных і розныя ваенныя матэрыялы. Наша авіяцыя падвергла бамбардыроўцы аэрадромы ў Корча і Аргірокастрон, знішчыўшы на зямлі самалёты праціўніка. Бамбардыроўцы падвергліся таксама паходныя калоны праціўніка. У паветраных баях намі збіта 11 самалётаў. Адзін з нашых самалётаў не вярнуўся на сваю базу».



Сеанс адначасовай ігры на 40 дошках чэмпіёна Беларусі па шахматах тав. Верасава ў беластоцкім Доме Чырвонай Арміі.

Фота А. Сапіра.

Шырэй разгорнем калектыўнае страхаванне жыцця працоўных

Калектыўнае страхаванне жыцця было ўведзена ў 1930 годзе і на працягу параўнаўча кароткага тэрміну набыло вялікую папулярнасць.

Непасрэднымі арганізатарамі і праваднікамі калектыўнага страхавання з'яўляюцца камісіі садзейнічання дзяржкрэдыту і ашчаднай справе (камсоды). Ад правільнай пастаноўкі іх работы ў значнай ступені залежыць поспех страхавання. Аднак яшчэ не ўсе камсоды па-сапраўднаму ўзяліся за гэту важную работу. Яны недастаткова праводзяць масава-растлумачальную работу. І не дзіва, што па вобласці ахоплена калектыўным страхаваннем толькі 5 тысяч чалавек. У Чыжаўскім раёне (старшы страхавы інспектар тав. Тарасаў) застрахавана толькі 14 чалавек, у Дамбраўскім (старшы страхавы інспектар тав. Чурак) — 20 чалавек, Заблудаўскім раёне — 30 чалавек.

Лепш абстаіць справа з калектыўным страхаваннем у Лапскім раёне (старшы страхавы інспектар тав. Хламенок). У раёне ахоплена калектыўным страхаваннем 610 чалавек. Калектывы служачых райвыканкома, райфінаддзела, выкладчыкі няпоўнай сярэдняй школы горада Лапы ахоплены страхаваннем на 100 працэнтаў. Аднак і ў Лапскім раёне на асобных прадпрыемствах не надаюць асаблівага значэння калектыўнаму страхаванню жыцця. На паравоза-вагонарамонтным заводзе старшыня заўкома тав. Агронаў не дапамагае камісіі садзейнічання ў праводзімай ёю рабоце. Дрэнна пастаўлена работа па калектыўнаму страхаванню ў Беластоку і Гродне.

Неабходна шырэй разгарнуць масава-растлумачальную работу сярод рабочых, служачых і калгаснікаў па калектыўнаму страхаванню.

Калектыўнае страхаванне прымаецца ў суме 500, 1000, 2.000, 3.000, 4.000 і 5.000 рублёў. За страхаванне ўплачваецца па 12 рублёў у год з кожнай тысячы страхавой сумы.

Е. Кульчыцкая.

Неразбярыха ў аблдораддзеле

Абласны дарожны аддзел мае сваю праектна-вышукальную групу. Гэтай групай кіруе па сумяшчэнню галоўны інжынер дарожнага аддзела тав. Ракавец. Ён штомесячна атрымлівае 350 рублёў за кіраўніцтва і кансультацыю. Але, як правіла, прыёмка работ ад групы ў натуры не робіцца. Вышукальнікам і праектыроўшчыкам прадастаўлена права складаць праекты нават часткамі і адсылаць на будаўніцтва без зацвярджэння.

У праекце дарогі Руткі—Дэмбнікі—Чарнова зроблена на адным кіламетры шэсць крывых, якія выпраўлены толькі пасля ўмяшання кіраўніцтва Замбраўскага раёна. Тэхнічным кіраўніком Беластоцкага райдораддзела быў складзен праект на дарогу. Пасля пабудовы (у асноўным) землянога палатна даўжынёй у два з паловай кіламетры тав. Ракавец дае ўказанне змяніць у асобных месцах праектныя адзнакі і радыусы крывых.

Праектная група мае нядрэнных спецыялістаў, але яны прадастаўлены самім сабе. Камісія па зацвярджэнню праектаў не створана, і праекты без зацвярджэння паступаюць на будаўніцтва.

У гэтым годзе абласным дарожным аддзелам было дапушчана вельмі многа памылак пры складанні праектаў. Аднак памылкі гэтыя не ўлічаны. Галоўны інжынер дораддзела тав. Ракавец працягвае працаваць па-старому. Вышукальныя работы на 1941 год і складанне праектаў па будаўніцтву дарог праводзяцца старымі метадамі.

Частка дарог, аднесеных абласным дарожным аддзелам у рэспубліканскія і абласныя, у вышуканне не ўключана, а некаторыя ўключаны толькі асобнымі кіламетрамі. Так, напрыклад, было ў Бранскім і Цэханавецкім раёнах. Парэцкі райдораддзел уключыў вышуканне адной дарогі, а абласны дарожны аддзел дае распараджэнне вышукваць зусім другую.

Усё гэта ствараецца таму, што галоўны інжынер дораддзела тав. Ракавец па-сапраўднаму не ўзначаліў тэхнічнага кіраўніцтва вышукальнымі работамі.

М. Сідачоў.

Перабудаваць фізкультурную работу

Фізкультурныя арганізацыі Беластоцкай вобласці дабіліся нямалых поспехаў у сваёй рабоце. У 22 раёнах створаны раённыя і гарадскія камітэты фізкультуры, якія аб'ядноўваюць 235 нізавых калектываў (у тым ліку 30 калгасных з агульным лікам 9 тысяч фізкультурнікаў).

Арганізавана 10 добраахвотных спартыўных таварыстваў. У закончыўшымся сезоне спаборніцтвамі па розных відах спорту было ахоплена каля 8 тысяч чалавек. Добрыя рэзультаты паказалі нашы фізкультурнікі на рэспубліканскім турніры па тэнісу, дзе наша вобласць заняла першае месца.

У Беластоцкай вобласці ёсць рад рэкардсменаў рэспублікі па такіх відах спорту, як гранатаметанне, штурханне ядра і т. д.

Комплексам «Гатоў да працы і абароны» першай ступені ахоплена 4.430 чалавек.

Аднак гарадскія і раённыя камітэты фізкультуры працуюць яшчэ слаба. Яны да гэтага часу апіраюцца больш на платны апарат, чым на актывістаў—грамадскіх інструктараў. Слаба пастаўлена сувязь з іншымі абароннымі арганізацыямі — Асоавіяхімам, Чырвоным Крыжам і т. д.

Выключнае значэнне мае зараз арганізацыйная работа па падрыхтоўцы да зімы: стварэнне секцый па зімніх відах спорту, арганізацыя хакейных каманд, падрыхтоўка каткоў, лыжных баз і т. д. Асаблівая ўвага павінна быць удзелена арганізацыі секцый рукапашнага бою, гімнастыкі, бокса.

Зіма наближаецца. Камітэты фізкультуры і спорту і кіраўнікі спартыўных таварыстваў павінны зараз-жа праверыць ход падрыхтоўкі да зімы і аказаць практычную дапамогу нізавым фізкультурным арганізацыям.

У бліжэйшы час неабходна дабіцца перабудовы работы фізкультурных арганізацый, так, як гэтага патрабуюць рашэнні X пленума ВЦСПС.

Я. Краверскі,
старшыня абласнога камітэта па справах фізкультуры і спорту.

—o—

НОВЫ ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

У былым маёнтку Скуп (Цэханавецкі раён), скора адкрыецца новы дзіцячы дом. Пачаліся ўжо работы па пераабсталяванню і рамонту будынкаў. На гэтыя работы адпушчана звыш 100 тысяч рублёў.

Гэта будзе першы дзіцячы дом у Цэханавецкім раёне.

—o—

ЧЭСНЫ ПАСТУПАК

Піонер 23-й беластоцкай школы Г. П. Лукашык знайшоў у магазіне № 192 249 рублёў 62 кап., якія зараз-жа занёс у 4-е аддзяленне міліцыі.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—97. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.